# Партызанскае Зуберава

**Такое незвычайнае збудаванне ў лесе з прыземленым дахам – сапраўдная партызанская**

**зямлянка. Гэта напамінак аб Вялікай Айчыннай вайне.**



*Ляснічы Старынскага лясніцтва Алег Лукша ля партызанскай зямлянкі*

Ляснічы Старынскага лясніцтва Алег Лукша расказвае, што 10 гадоў назад лясніцтва зрабіла рэканструкцыю зямлянкі і многія гады вядзе над гэтым месцам шэфства, клапоціцца, каб земляны схрон быў захаваны як гістарычная сведка вайны. Тут праводзяцца экскурсіі для вучняў.

Зямлянка знаходзіцца ля вёскі Зуберава, якая ў ліпені 1943 года была спалена гітлераўцамі. Густы лес ля населенага пункта быў месцам размяшчэння партызанскіх атрадаў.

Тут, у Рудзьмянскай пушчы, у 1943-44 гадах базіраваліся

стаўбцоўскі падпольны райкам КП(б)Б на чале з У. Царуком і падпольны райкам ЛКСМБ на чале з А. Мамантавым, аб чым сведчыць мемарыяльная дошка на помніку на ўзлеску, ля дарогі, што вядзе ў Зуберава.

Старынскае лясніцтва разам з Шашкоўскай СШ, дзе працуе лепшае ў раёне школьнае лясніцтва «Бярозка», маюць клопат даглядаць стэлу ў гонар партызан і падпольшчыкаў. Тут заўсёды наведзены парадак. І ў сучасны момант напрадвесні пабелены помнікавы падмурак, ачышчана тэрыторыя ад іглiцы, мінулагодняга лісця, сухіх галін.

У дні святкавання Дня Перамогі і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысskіх захопнікаў ля стэлы праводзяцца мітынгі.

**Святлана ЖЫБУЛЬ, фота Васіля ЗЯНЬКО**